УДК 930(476)

# БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ Ў ПАЛІТЫЦЫ ПОЛЬСКІХ УЛАД 1918–1921 гг. : ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

*Цымбал Аляксандр Георгіевіч*
дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

***Артыкул прысвечаны агляду некаторых дыскусійных праблем, што ўзнімаюцца ў беларускай і польскай гістарыяграфіі адносна беларускага пытання ў польскай палітыцы ў 1918–1921 гг.***

На сённяшні дзень па праблеме палітыкі польскіх улад адносна беларускага пытання ў 1918–1921 гг. паўстала дастаткова шырокая гістарыяграфія, працы па дадзенай тэме пачалі з'яўляцца яшчэ ў міжваенны перыяд. Першыя беларускія савецкія даследчыкі праблемы, выхадцы з беларускага руху, Ф. Турук [1], У. Ігнатоўскі [2–4], З. Жылуновіч [5], зыходзілі з антыпольскіх пазіцый і адзіны магчымы варыянт развіцця беларускай нацыі бачылі ў федэрацыі з Савецкай Расіяй. У 1930-я гг. нацыянальная тэматыка ў СССР сыходзіць на перыферыю ў сувязі з барацьбой з «нацыянал-дэмакратызмам». Падкрэсліваўся міралюбівы характар савецкай знешняй палітыкі адносна Польшчы, гатоўнасць ісці на ўступкі, нават тэрытарыяльныя, і адначасова выкрываліся захопніцкія памкненні польскага кіраўніцтва адносна беларускага насельніцтва [6–8].

У міжваеннай польскай гістарыяграфіі да беларускага пытання з мэтай выпрацоўкі шляхоў рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў сваіх даследаваннях Л. Васілеўскі [9] і К. Сракоўскі [10] шукалі шляхі інтэграцыі беларускага насельніцтва ў польскую дзяржаву і прыходзілі да высноў аб неабходнасці ўліку эканамічных, культурных і нацыянальных інтарэсаў беларусаў.

У пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі заставаўся акцэнт на выкрыцці імперыялістычных намераў польскага кіраўніцтва [11]. У гістарыяграфіі ПНР можна вылучыць працу Ю. Левандоўскага, прысвечаную эвалюцыі поглядаў пілсудчыкаў на праблему ўсходняй граніцы Польшчы ў залежнасці ад сітуацыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў Беларусі і Літве. Аўтар разглядаў савецка-польскі канфлікт як барацьбу двух федэралізмаў, савецкага і польскага, якія меў імперыялістычны характар. Традыцыйна для польскай марксісцкай гістарыяграфіі аўтар крытыкаваў палітычны рэжым міжваеннай Польшчы, сцвярджаючы, што зафіксаваны ў Рыжскім міры тэрытарыяльны падзел стаў адной з прычын слабасці польскай дзяржаўнасці [12].

Сучасная польская гістарыярафія надае вялікую ўвагу пытанням усходняй граніцы, узаемаадносінам з нацыянальнымі рухамі і інш. Польскі гістарычны наратыў падзей аднаўлення дзяржаўнасці і польска-савецкай вайны прадстаўляе падзеі як перамогу палякаў, якая спыніла распаўсюджванне бальшавіцкай рэвалюцыі ў Еўропе, а таксама дае выключна негатыўную ацэнку бальшавіцкай палітыкі адносна Беларусі і пазітыўную ацэнку дзейнасці Пілсудскага.

Інтэрпрэтацыі падзей у сучаснай беларускай гістарыяграфіі сканцэнтраваны вакол дзейнасці беларускіх дзеячаў розных палітычных поглядаў, спроб адбудовы беларускай ідэнтычнасці і стварэння ўласнай дзяржаўнасці, пошуку саюзнікаў у гэтай справе, апынуўшыся заціснутымі паміж амбіцыямі Польшчы і бальшавіцкай Расіі. Шмат увагі надаецца сацыяльным пытанням. Асноўныя вырашальныя падзеі гэтага перыяду праходзілі нібыта «над галовамі» беларусаў, але вызначалі іх лёс.

У вялікім комплексе праблем польскай усходняй і нацыянальнай палітыкі можна паспрабаваць адзначыць некаторыя, якія і на сённяшні дзень выклікаюць неадназначныя трактоўкі і з'яўляюцца прадметам навуковай дыскусіі.

У пачатак XX ст. палякі і беларусы ўвайшлі будучы часткай імперый. Нацыянальныя рухі, хоць і праходзілі з рознай «гістарычнай хуткасцю», але інтэлектуальныя эліты народаў сфармулявалі праграмы нацыянальнага вызвалення і самавызначэння, падышлі да стварэння ўласнай дзяржаўнасці.

Праблема зводзілася да таго, што польскія палітыкі, зыходзячы з «гістарычнага права», бачылі будучую Польшчу выключна ў граніцах Рэчы Паспалітай 1772 г. Гістарыяграфічнай праблемай тут з'яўляецца пытанне, наколькі ідэі адбудовы «гістарычнай» Рэчы Паспалітай, як галоўнай ідэі ўсяго польскага нацыянальнага руху з канца XVIII ст., адпавядалі рэаліям XX ст. Вернасць гістарычнай традыцыі аднаўлення шляхецкай дзяржаўнасці стала асновай для нацыянальных міфаў, якія хоць і спрыялі росту польскага патрыятызму, але супярэчылі новым рэаліям і непазбежна прыводзілі да сутыкнення з суседзямі.

Адной з ключавых праблем беларуска-польскіх узаемаадносін выступае нацыянальная структура заходнебеларускага рэгіёна. Можна сцвярджаць, што нацыянальнае пытанне было галоўным ва ўсходняй палітыцы польскіх улад. І перапісы насельніцтва былі адным з інструментаў вырашэння гэтага пытання. Так, перапіс 1919 г., праведзены на тэрыторыях, падкантрольных Цывільнай Управе Усходніх зямель, спрыяў не столькі вывучэнню, колькі хутчэй канструяванню нацыянальнай структуры заходнебеларускага рэгіёна ў патрэбным польскім уладам кірунку для дэманстрацыі дамінацыі польскага элементу. Кіраўнік ЦУУЗ, адзін з першых, хто пакінуў заўвагі аб перапісе, Е. Асмалоўскі, сцвярджаў, што галоўнай мэтай перапісу было прадставіць мясцовае насельніцтва як несвядомую ў нацыянальным сэнсе масу, за выключэннем палякаў. «Палякі маглі б кіраваць краінай насуперак інтарэсам беларусаў», – пісаў Асмалоўскі [13, s. 93]. Такое бачанне беларускіх зямель было ў Ю. Пілсудскага і адлюстроўвала погляды амаль усяго польскага грамадства. Працягнулі «традыцыю» маніпуляцый і перапісы 1921 і 1931 гг., пра якія Э. Штурм дэ Штрэм (у 1929–1939 гг. кіраўнік Галоўнай статыстычнай управы) сцвярджаў, што абодва былі сфальсіфікаваны.

Польскія палітыкі, а таксама землеўладальнікі на беларускіх землях, прыменшвалі, а часта ігнаравалі беларускі нацыянальны рух і беларускае насельніцтва. Фактычна адбывалася дэсуб'ектывізацыя беларусаў. Беларускі рух ацэньваўся праз прызму рэалізацыі ўласных мэт. Асноўныя польскія дзеячы непрыязна ставіліся да беларускага адраджэння, не прызнавалі спроб беларускага дзяржаўнага самавызначэння, надалей называючы яе жыхароў панятцем «этнаграфічнай масы». Як у сваім выданні пісаў В. Лютаслаўскі, беларусы – «насельніцтва, пераходнае паміж палякамі і маскавітамі». Аўтар выказваў думкі аб нацыянальнай неразвітасці беларусаў, што абгрунтоўвала арганічнасць далучэння беларускіх зямель да Польшчы. Ідэя падмацоўвалася думкамі аб цывілізацыйнай місіі польскага насельніцтва на ўсходзе Еўропы [14].

Дыскусійным застаецца пытанне стаўлення да беларусаў польскіх палітычных груповак і іх лідараў. Праблема, як разумеў беларускае пытанне і шляхі яго вырашэння Пілсудскі, уяўляецца вельмі неадназначнай. У савецкай і польскай марксісцкай гістарыяграфіі найбольш распаўсюджаным з'яўляўся погляд, што Пілсудскі паступова схіляўся на карысць правых, набліжаючыся да Дмоўскага і Нацыянальнага камітэту ў Парыжы. Сучасная польская гістарыяграфія хутчэй апалагетычна падыходзіць да яго дзейнасці. Агульнапрынятым у польскай гістарычнай навуцы з'яўляецца погляд, што польскі экспансіянізм на ўсходзе быў непазбежным этапам развіцця нацыі і адыграў у свой час станоўчую ролю. Сцвярджаецца, што маршал безагаворачна падтрымліваў ідэю федэралізацыі, і лічыцца, што нават Рыжскі мір быў паражэннем Пілсудскага, бо перамаглі прыхільнікі інкарпарацыі. У той жа час, аднак, і ў Пілсудскага, і ў Дмоўскага былі выказванні, якія фактычна адмаўлялі беларусам у нацыянальным існаванні. Гэта дае падставы В. Бароўскай сцвярджаць, што ніводная з польскіх канцэпцый усходняй палітыкі не разглядала тэрыторыю Беларусі ў якасці самастойнай дзяржаўна-палітычнай адзінкі [15].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што на сённяшні дзень гістарыяграфія праблемы нацыянальнай і ўсходняй палітыкі польскіх улад хоць і зрабіла вялікі крок наперад, аднак захавала шматлікія стэрэатыпныя ўяўленні. Для савецкай і беларускай гістарыяграфіі гэта будзе ў першую чаргу класава-сацыяльная метадалогія да вывучэння праблематыкі, да якой дадаліся нацыянальна-дзяржаўныя пазіцыі. Польскай гістарыяграфіі быў уласцівы дыскурс абгрунтавання гістарычных правоў і дамінавання польскага элемента на беларускіх землях.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М., 1921. – 142 с.
2. Игнатовский, В. Белоруссия: территория, население, экономика, важнейшие моменты истории / В. Игнатовский. – Минск : Бел.,1924. – 51 с.
3. Ігнатоўскі, У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. – Менск [Мінск] : Дзярж. выд. Беларусі, 1925. – 176 с.
4. Ігнатоўскі, У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця: лекцыі, чытаныя студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / У. Ігнатоўскі. – Выд. 2-е, стэрэатыпнае. – Менск [Мінск] : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1926. – 251 с.
5. Жылуновіч, З. Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / З. Жылуновіч. – Менск [Мінск] : Выданне Цэнтральнага выканаўчага камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, 1924. – 322 с.
6. Шчарбакоў, В. К. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі и белапольская акупацыя / В. К. Шчарбакоў. – Менск : Беларус. дз. выд-ва, 1930. – 127 с.
7. Каменская, Н. В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Н. В. Каменская. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя палітычнай літаратуры, 1946. – 168 с.
8. Лочмель, І. Барацьба беларускага народа супраць інтэрвентаў: Да 20-й гадавіны вызвалення Беларусі ад белапол. акупантаў / І. Лочмель. – Мн. : Дзяржвыд пры СНК БССР. Рэд. паліт. літ., 1940. – 114 с.
9. Wasilewski L. Litwa i Białoruś : zarys historyczno-polityczny stosunków narodowościowych / L.Wasilewski. – Warszawa ; Kraków : Wydawnictwo J. Mortkowicza Towarzystwo Wydawnicze w Warszawie, 1925. – 251 s.
10. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków : [s.n.], 1925. – 56 s.
11. Ольшанский, П. Н. Рижский мир. Из истории борьбы Советского правительства за установление мирных отношений с Польшей (конец 1918 – март 1921 г.) / П. Н. Ольшанский. – М. : Наука, 1969. – 261 с.
12. Lewandowski, J. Federalizm : Litwa i Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI 1918 – IV 1920) / J. Lewandowski. Warszawa : PWN, 1962. – 269 s.
13. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918–1922) / К. Гамулка. – Вільня, 2008. – с. 93.
14. Lutosławski, W. Lithuania and White Ruthenia / W. Lutosławski. – Paris : [Imprimerie Levé], 1919. – P. 36.
15. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова